**УДК 392.1(476)«19/20»**

# ПАХАВАЛЬНА-ПАМІНАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І СУЧАСНЫ СТАН ДАСЛЕДАВАННЯЎ

***Ул.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Аналізуецца гістарыяграфія і сучасны стан даследаванняў пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння. Прыходзім да высновы, што гісторыя вывучэння гэтай праблематыкі мае даўнюю традыцыю. Першыя працы, што змяшчаюць матэрыялы па пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння, з'явіліся яшчэ ў канцы XVI стагоддзя. Але па-сапраўднаму цікавасць да беларускага народа і яго культуры абуджаецца толькі ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя і звязана з уплывам рамантызму. За перыяд XIX – пач. XXI стагоддзя па гэтай тэме быў назапашаны багаты фактычны матэрыял. На яго аснове з'явіўся шэраг даследаванняў, якія адрозніваюцца паміж сабой як паводле канкрэтных пытанняў, якія ў іх разглядаюцца, так і паводле падыходаў адносна іх асвятлення. Нягледзячы на гэта, на сённяшні дзень комплекснага і сістэмнага даследавання, прысвечанага пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння, не існуе, і дадзеная праблема патрабуе грунтоўнага аналізу і падрабязнага асвятлення.*

**Уводзіны.** Пахавальна-памінальная абраднасць займае выключнае месца ў народнай культуры. Даследчыкі неаднаразова адзначалі кансерватыўнасць і ўстойлівасць гэтых абрадаў у культуры розных этнасаў, у тым ліку і беларусаў. У сілу сваёй традыцыйнасці яны з'яўляюцца самай інфармацыйнай (а таму вельмі важнай і каштоўнай) крыніцай для вывучэння і рэканструкцыі карціны свету чалавека, традыцыйнай культуры. Для беларускіх рэалій гэта тым больш актуальна, бо традыцыйная культура стала падмуркам культуры нацыянальнай. Таму даследаванне гэтай праблематыкі не толькі дазваляе значна лепш разумець многія праявы матэрыяльнай і духоўнай культуры, але і вызначыць этнічную спецыфіку беларускага этнасу. Разам з тым цікавасць да гэтай праблематыкі тлумачыцца і шэрагам іншых істотных акалічнасцяў. Нягледзячы на тое, што пахавальна-памінальная абраднасць з'яўляецца адным з самых кансерватыўных элементаў культуры, яна не застаецца нязменнай. Калі яшчэ ў канцы XIX стагоддзя беларускі этнас можна характарызаваць як традыцыйную супольнасць, то на працягу XX – пач. XXI стагоддзя сітуацыя карэнным чынам мяняецца. Працэсы, што адбываліся ў гэты перыяд у беларускай вёсцы (галоўным асяродку існавання традыцыі), прывялі да істотных зменаў, якія закранулі і пахавальна-памінальную абраднасць. Даследаванне эвалюцыі пахавальна-памінальнай абраднасці, аналіз дынамікі яе зменлівасці, выяўленне традыцыйных і новых элементаў, а таксама аналіз фактараў, што паўплывалі на гэтыя працэсы, з'яўляюцца таксама важнымі накірункамі. Пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў не з'яўляецца аднароднай на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Яна мае як рэгіянальную спецыфіку, так і мноства лакальных варыянтаў у межах асобных гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў. Існаванне гэтых асаблівасцяў патрабуе ад этнографаў надання большай увагі арэальным даследаванням. Гэта безумоўна адносіцца і да Падзвіння.

Такім чынам, даследаванне пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ўяўляе вельмі важны і актуальны накірунак у беларускай этналагічнай навуцы. Правядзенне найбольш эфектыўнага даследавання немагчыма без падсумавання вопыту папярэднікаў, якія вывучалі гэты сегмент народнай культуры, без аналізу і характарыстыкі тых прац, што былі прысвечаны азначанай праблематыцы. Таму мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз гісторыі вывучэння пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння і характарыстыка сучаснага стану даследаванняў у гэтай вобласці. У артыкуле прадстаўлены агляд толькі этнаграфічных даследаванняў пахавальна-памінальнай абраднасці. Акрамя таго, па дадзенай праблеме існуе шэраг даследаванняў беларускіх археолагаў, характар і спецыфіка якіх патрабуюць іх асобнага разгляду.

**Асноўная частка.** Вывучэнне пахавальных і памінальных абрадаў беларусаў Падзвіння мае даўнія традыцыі. Бадай, першым, хто пакінуў звесткі па гэтай тэме, быў лютэранскі пастар, немец па паходжанні **Паўль Одэрборн** (каля 1555 – 1604 гг.). У час Лівонскай вайны, будучы вайсковым капеланам, ён пэўны час знаходзіўся на Падзвінні. Тут Одэрборн і зрабіў апісанне побыту мясцовага насельніцтва. Гэта апісанне, скончанае ў 1581 годзе, было выканана ў выглядзе ліста да лютэранскага тэолага Давіда Хітрэуса. У 1582 годзе праца выйшла асобным творам на лацінскай мове пад назвай «Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў, [іх] шлюбныя і пахавальныя абрады, побыт, адзенне і г.д., а таксама пра веру і звычаі татараў» [1]. Матэрыялы, змешчаныя ў творы, як мяркуе Г. Сагановіч, адносяцца да Полацка-Дзісенскага Падзвіння [2, с. 162 – 163]. У сваёй працы П. Одэрборн прыводзіць даволі цікавыя і каштоўныя апісанні пахавальнага абраду і памінальнай вячэры ў дзень пахавання [1, с. 176 – 178]. Характарызуючы пахавальны абрад, аўтар згадвае пра звычай абмывання нябожчыка, апісвае дарогу да могілак, дзеянні на саміх могілках, а таксама гаворыць пра галашэнні па памерламу і нават прыводзіць іх тэксты. Пры апісанні памінальнай вячэры аўтар як адну з негатыўных рысаў мясцовага насельніцтва пазначае празмернае ўжыванне алкагольных напояў.

У адрозненне ад стыхійнага і аматарскага захаплення этнаграфіяй у мінулыя часы, з канца XVIII – пач. XIX стагоддзя назіраецца павелічэнне навуковай цікавасці да беларускай народнай культуры. Гэты інтарэс да культуры беларускага сялянства з боку мясцовай інтэлігенцыі быў абумоўлены ўплывам рамантызму – ідэйна-мастацкага накірунку, што прыйшоў на змену эпохі Асветніцтва. Для гэтага часу характэрна з'яўленне першых прац, прысвечаных розным бакам беларускай народнай культуры, у тым ліку і пахавальна-памінальнай абраднасці.

Адным з даследчыкаў народнай культуры першай паловы XIX стагоддзя быў ураджэнец Віцебшчыны **Казімір Фалютынскі**. У 1828 годзе ў у часопісе «Веснік Еўропы» выйшла яго праца «Народныя святы, забавы, павер'і і забабонныя абрады жыхароў Беларусі» [3], матэрыялы да якой аўтар збіраў у ваколіцах Віцебска, Полацка, Лепеля, Суража, Гарадка. Выданне гэтага артыкула стала вельмі значнай падзеяй для айчыннага нарадазнаўства, бо «ўпершыню маскоўскі часопіс так шырока прадставіў фальклор паўночнай Беларусі» [4, с. 68]. Разам з фальклорнымі матэрыяламі праца змяшчае і этнаграфічныя. У дадзеным артыкуле знаходзім сціслую інфармацыю адносна памінальных традыцый беларусаў Віцебшчыны [3, с. 82 – 83, с. 87 – 88].

Выдатным даследчыкам і збіральнікам вуснапаэтычнай творчасці беларусаў Падзвіння першай паловы XIX стагоддзя з'яўляецца **Аляксандр Рыпінскі**. Яшчэ ў час навучання ў Віцебскай гімназіі ён актыўна займаўся запісам і вывучэннем фальклору мясцовага беларускага насельніцтва. Пасля паўстання 1830 – 1831 гадоў Рыпінскі быў вымушаны эміграваць у Францыю і пасяліўся ў Парыжы. Тут на аснове аднаўленых па памяці страчаных фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў ім была выдадзена праца «Беларусь. Колькі слоў аб паэзіі простага люду той нашай польскай правінцыі, аб яго музыцы, спевах, танцах і інш.» (1840 г.) [5]. Нягледзячы на прапольскую пазіцыю аўтара, гэтае выданне адыграла значную ролю, бо «ўпершыню ў сталіцы еўрапейскай цывілізацыі з'явілася манаграфія, якая расказала пра самабытнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, іх эстэтыку, этыку, псіхалогію, мараль» [6, с. 156]. Першае месца ў зборніку Рыпінскі адвёў раздзелу «Спевы». Характарызуючы песенны фальклор беларусаў Падзвіння, аўтар згадвае і такі жанр, як «жалобныя песні» (галашэнні) [5, s. 59 – 64]. Нягледзячы на тое, што «жалобныя песні» складаюць невялікі па аб'ёме раздзел і не атрымалі належнай увагі, А. Рыпінскі быў адным з першых, хто звярнуўся да гэтага жанру беларускага фальклору.

Адметнай падзеяй для беларускай этнаграфіі першай паловы XIX стагоддзя стаў выхад у 1847 годзе ў Вільні кнігі **Яўстафія Тышкевіча** «Апісанне Барысаўскага павета...» [7]. Гэту працу можна лічыць фактычна адзінай этнаграфічнай манаграфіяй у класічным разуменні гэтага слова, што выйшла ў першай палове XIX стагоддзя. Кніга ўтрымлівае цэлы шэраг апісанняў памінальных абрадаў і звычаяў (Радаўніца, прыкладзіны, Стаўроўскія і Змітраўскія Дзяды) беларусаў Барысаўскага павета. Большасць запісаў, змешчаных у кнізе, адносяцца да Цэнтральнай Беларусі. Але часам Я. Тышкевіч выкарыстоўвае матэрыялы і з іншых рэгіёнаў. Так, у працы знаходзім кароткія звесткі аб памінальных традыцыях на Стаўроўскія Дзяды беларусаў у ваколіцах Докшыцаў [7, s. 376]. Пры апісанні гэтага звычаю аўтар выкарыстоўвае паданне, запазычанае ім у пісьменніка і этнографа **Яна Баршчэўскага** з твора «Шляхціц Завальня», і якое адносіцца да Падзвіння [8, с. 139].

Новы і значны імпульс у актывізацыі этнаграфічнага даследавання Беларусі быў выкліканы заснаваннем у 1845 годзе ў Санкт-Пецярбургу Рускага геаграфічнага таварыства (РГТ), дзе была распрацавана праграма па збіранню і фіксацыі этнаграфічных матэрыялаў, разасланая ў 1847 годзе па краіне. У адказ на гэту праграму сталі прыходзіць матэрыялы з месцаў, у тым ліку і з беларускіх губерняў. Некаторыя з гэтых матэрыялаў друкаваліся ў «Этнаграфічным зборніку». Так, у другім яго выпуску (1854 г.) выйшла праца «Быт беларускіх сялян» [9], прысвечаная беларусам Падзвіння. Яе аснову склалі матэрыялы селяніна-вольнаадпушчанніка **Мікалая Анімеле**. Матэрыялы, якія адносяцца да пахавальна-памінальных звычаяў, уключаны ў два раздзелы: «Хаўтуры» [9, с. 209 – 212] і «Дзяды» [9, с. 212 – 214]. У першым раздзеле змяшчаецца апісанне пахавальнага абраду, а ў другім М. Анімеле падае звесткі аб памінальных традыцыях. Тут аўтар гаворыць пра чатыры памінальныя дні: субота перад мясапусным тыднем, аўторак на другім тыдні пасля св. Вялікадня, субота перад св. Тройцы і апошняя субота перад днём св. Дзмітрыя. Характарызуючы пахавальна-памінальную абраднасць, аўтар адзначае і асаблівасці правядзення гэтых абрадаў беларусамі каталіцкага веравызнання.

Акрамя прац, што былі дасланыя ў адказ на праграму РГТ, у сярэдзіне XIX стагоддзя з'явіліся і іншыя апісанні беларускіх этнографаў-аматараў. Сярод іх асобнае месца належыць **Паўлу Шпілеўскаму** і яго працы «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках»[1]. Праца друкавалася ў 1853 – 1856 гадах у часопісе «Пантэон» і складаецца з 16 нарысаў, якія даюць каштоўны матэрыял для вывучэння побыту і вуснай народнай творчасці беларусаў сярэдзіны XIX стагоддзя. Усе нарысы можна ўмоўна падзяліць на этнаграфічныя і фальклорныя. Этнаграфічная частка ўключае матэрыялы і па пахавальна-памінальнай абраднасці, якія былі выдзелены ў спецыяльны раздзел «Пахаванне і памінкі» і змешчаны ў 25 томе за 1856 год [10, с. 12 – 30]. Пачынае раздзел аўтар з апісання перадсмяротнай агоніі

[1] Пад назвай Беларусь аўтар разумее Віцебскую, Мінскую, Магілёўскую і частку Смаленскай губерні [11, с. 72].

чалавека, згадвае пра абмыванне нябожчыка, выраб труны, пашыў адзення, а таксама апісвае само пахаванне. Асобную ўвагу Шпілеўскі ўдзяляе характарыстыцы пахавання самагубцаў і нехрышчоных дзяцей. Аўтар апісвае і памінальныя звычаі беларусаў. Ён гаворыць пра «прыкладзіны» на сёмы дзень, коратка ўпамінае пра Дзяды і змяшчае даволі падрабязнае апісанне памінальных традыцый на Радаўніцу. Большасць матэрыялаў, змешчаных у працы, сабраныя Шпілеўскім самастойна, за выключэннем запазычаных у Я. Тышкевіча апісання памінак [41, с. 7]. Робячы свае апісанні, аўтар прыводзіць шмат прыкмет, павер'яў і забабонаў. Адносна некаторых з іх даследчыкі не знаходзяць аналагаў у іншых працах. Такая сітуацыя, па меркаванні У. Васілевіча, выклікана тым, што Шпілеўскі «не заўсёды прытрымліваўся этнаграфічнай дакладнасці і ва ўгоду займальнасці падключаў часам фантазію» [41, с. 7].

Пэўную цікавасць пры даследаванні народнай культуры беларусаў уяўляюць гісторыка-геаграфічныя апісанні. З ліку такіх апісанняў першай паловы XIX стагоддзя асабліва вылучаецца праца **М.В. Без-Карніловіча** «Гістарычныя звесткі пра выдатныя месцы на Беларусі з дадаткам і іншых звестак, якія да яе ж адносяцца» (1855 г.) [12]. У гэтым выданні аўтар акрамя гістарычнага матэрыялу і багатых статыстычных звестак змяшчае і характарыстыку народнай культуры беларускага насельніцтва Віцебскай і Магілёўскай губерняў[1]. У працы М.В. Без-Карніловіча знаходзім таксама і кароткія звесткі агульнага характару аб памінанні продкаў [12, с. 246].

Новы этап у даследаванні народнай культуры беларусаў прыпадае на 1860 – 1870-я гады. У гэты перыяд беларуская этнаграфія робіць вялікі крок наперад. Значную ролю ў этнаграфічным вывучэнні краю ў канцы 60 – першай паловы 70-х гадоў XIX стагоддзя адыграла адкрыццё ў 1867 годзе ў Вільні Паўночна-Заходняга аддзела Рускага Геаграфічнага таварыства [32, с. 36]. У гэты час з'яўляецца шэраг цікавых даследаванняў, сярод якіх, зыходзячы з нашай праблематыкі, асаблівы інтарэс уяўляе праца **М.А. Дзмітрыева** «Збор песень, казак, абрадаў і звычаяў сялян Паўночна-Заходняга краю» (1869 г.) [13]. Праца змяшчае песні і тлумачэнні да іх, казкі, а таксама апісанні абрадаў. У кнізе сустракаем матэрыялы і адносна пахавальна-памінальных традыцый беларусаў, шэраг з якіх запісаны на Дзісеншчыне. Аўтар змяшчае апісанні пахавальнага абраду [13, с. 210 – 213], характарызуе памінальныя звычаі на Радаўніцу, Стаўроўскія і восеньскія Дзяды [13, с. 213 – 220], а таксама змяшчае шэраг прымет і павер'яў, што з імі звязаныя [13, с. 259, с. 260, с. 262]. Аднак большасць матэрыялаў, як мяркуюць даследчыкі, не была запісана ўласна М. Дзмітрыевым, а ўзята з выданняў папярэдніх аўтараў [32, с. 38; 41, с. 7 – 8].

Багатымі і цікавымі матэрыяламі вылучаюцца працы іншага даследчыка, чыя дзейнасць адносіцца да 60 – 70-х гадоў XIX стагоддзя, **Юліяна Крачкоўскага**. У 1874 годзе выходзіць яго кніга «Быт заходнебеларускага селяніна» [14]. У сваёй працы аўтар змяшчае апісанні абрадаў пахавання і памінання нябожчыкаў [14, с. 156 – 160, с. 181, с. 189, с. 198 – 201]. У кнігу ўвайшлі матэрыялы, што друкаваліся раней, а таксама і новыя, некаторыя з якіх адносяцца да паўднёва-заходняй часткі Падзвіння (Дзісенскі павет) [14, с. 157].

У сярэдзіне 60-х гадоў XIX стагоддзя пачынаецца дзейнасць адметнай у беларускай этнаграфіі асобы – **Паўла Васільевіча Шэйна**. Першай працай, у якой П.В. Шэйн звяртаецца да пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў, быў зборнік «Беларускія народныя песні» (1874 г.) [15]. Гэтаму пытанню быў прысвечаны асобны раздзел «Пахаванне (хаўтуры) і дзяды» [15, с. 370 – 377]. Раздзел змяшчае некалькі галашэнняў і апісанні пахавальных абрадаў, запісаных ў Віцебскай губерні.

Шэраг апісанняў пахавальных і памінальных абрадаў беларусаў Падзвіння сустракаем і ў перыядычных выданнях таго часу. Так, пэўную цікавасць уяўляюць працы **Ф. Сярэбранікава**, а перадусім артыкул «Звычаі і абрады сялян Себежскага павета пры хрэсьбінах, вяселлі і пахаванні» [16], які быў змешчаны ў «Памятнай кніжцы Віцебскай губерні» на 1865 год. Апісанне пахавальна-памінальных традыцый беларусаў Себежскага павета аўтар змяшчае ў раздзеле «Пахаванне» [16, с. 89 – 90]. Збольшага тут прыводзіцца характарыстыка рэлігійнай часткі пахавальнага і памінальнага абраду. Акрамя таго, Ф. Сярэбранікаў прыводзіць інфармацыю пра цікавы звычай «апахівання» магілы бярозавымі галінкамі (сцябанне бярозавымі галінкамі магілы) – звычай «парыць старыкоў» [16, с. 90]. У іншай сваёй працы «Аб народных святах Себежскага павета», што змешчана ў «Памятнай кніжцы Віцебскай губерні» за 1867 год аўтар прыводзіць малітву жабрака за памерлых [17, с. 246 – 247].

Каштоўную інфармацыю аб памінанні продкаў сялянамі памежнай з Цэнтральнай Беларуссю Бягомльшчыны ўтрымлівае артыкул **Сімяёна Нячаева** «Нешта з рэлігійных абрадаў і забабонаў у Бягомльскім прыходзе Барысаўскага павета» [18], што змешчаны ў неафіцыйнай частцы «Мінскіх епархіяльных ведамасцей» за 1874 год (№ 7). Памінальным звычаям прысвечана асобная частка «Пра памінанне памерлых» [18, с. 227 – 229]. У ёй аўтар апісвае памінальны абрад на саракавы дзень пасля смерці («шасціны») і асеннія памінальныя традыцыі.

Найбольш плённымі па даследаванню народнай культуры беларусаў і публікацыі этнаграфічных даследаванняў былі апошнія два дзесяцігоддзі XIX і пачатак XX стагоддзя. У гэты час працягвае сваю дзейнасць П.В. Шэйн. Пасля выдання «Беларускіх народных песень» Шэйн не без дапамогі вялікай кагорты карэспандэнтаў распачаў актыўную дзейнасць па зборы этнаграфічных і фальклорных матэры-

[1] Менавіта толькі гэтыя дзве губерні аўтар адносіць да Беларусі.

ялаў. У выніку гэтай працы была сабрана вялікая колькасць інфармацыі, якая ўтварыла 4 зборнікі «Матэрыялаў для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (1887 – 1902 гг.). Тэме пахавальна-памінальнай абраднасці збіральнік прысвяціў асобны раздзел: «Абрады пахавальныя і памінальныя, галашэнні і прычытанні над памерлым» у 2 частцы І тома «Матэрыялаў...» [19, с. 503 – 708]. Раздзел дзеліцца на тры часткі. Першая з іх «Абрады пахавальныя» ўключае апісанні пахавальных абрадаў, другая «Абрады памінальныя, памінкі, Дзяды» ўтрымлівае апісанні памінальных звычаяў, а трэцяя «Галашэнні ці прычытанні над памерлымі» змяшчае два апісанні галашэнняў, адно з якіх зробленае ў Віцебскім павеце, і тэксты саміх галашэнняў. У іншых тамах зборніка П. Шэйн таксама змяшчае матэрыялы па дадзенай праблематыцы [20, с. 652 – 673; 21, с. 16 – 17, с. 68 – 69, с. 73, с. 89 – 90, с. 164, с. 353 – 354, с. 372 – 375, 516 – 518]. Значная колькасць апісанняў, змешчаных у «Матэрыялах...», была сабраная на Падзвінні карэспандэнтамі Шэйна. Адным з самых актыўных яго карэспандэнтаў быў **Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі**, які і сабраў большасці матэрыялаў, што адносяцца да пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ў гэтых зборніках. Пачынаючы як карэспандэнт П. Шэйна, Нікіфароўскі ў наступным вырашае праводзіць уласную навуковую дзейнасць. За дваццацігадовы адрэзак самастойнай працы (1890 – 1910 гг.) навукоўцам былі выдадзены і падрыхтаваны каля 20 прац. Сярод іх вялікую каштоўнасць уяўляе яго даследаванне «Прастанародныя прыкметы і павер'і, прымхлівыя абрады і звычаі, легендарныя паданні пра асоб і мясціны» (1897 г.) [22], якое змяшчае больш за дзве тысячы розных прыкмет, павер'яў, звычаяў і абрадаў беларусаў Падзвіння. Праца складаецца з 7 раздзелаў. Зыходзячы з нашай праблематыкі найбольшую цікавасць уяўляе яе шосты раздзел «Да вечара – не рана». У яе Нікіфароўскі ўключыў прыкметы, якія прадвяшчаюць хуткую смерць (падраздзел IV «Смяротныя хваробы» [22, с. 278 – 282]), павер'і і звычаі, пачынаючы ад смерці чалавека і да яго пахавання (падраздзел VI «Мрэц, нябожчык» [22, с. 285 – 295]), а таксама абрады, звычаі і павер'і пры памінанні памерлых нябожчыкаў (падраздзел VII «Дзяды» [22, с. 295 – 297]). У асобны падраздзел («Смець чараўніка» [22, с. 282 – 285]) аўтар вылучае павер'і, звязаныя са смерцю чараўніка. Шэраг матэрыялаў, што адносяцца да пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння знаходзім і ў іншых працах Нікіфароўскага. Некаторыя звесткі аб памінальных стравах, іх асартыменце і тэрмінах ужывання змяшчаюцца таксама ў «Нарысах простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі...» (1895 г.) [23, с. 17 – 18, с. 20 – 21, с. 58 – 59]. А ў нарысе «Старцы» (1892 г.) аўтар гаворыць аб ролі і месцы гэтай сацыяльнай групы ў памінанні продкаў [24, с. 73, с. 79 – 81, с. 86, с. 87, с. 89, с. 96 – 97].

Каштоўныя этнаграфічныя звесткі аб пахавальных і памінальных традыцыях беларусаў Падзвіння змяшчаюцца ў раздзеле «Насельніцтва губерні» кнігі **В. Далгарукава** «Віцебская губерня: Гісторыка-геаграфічны і статыстычны агляд» (1890 г.) [25, с. 269 – 273]. Характарызуючы пахавальна-памінальную абраднасць, аўтар адзначае, што акрамя царкоўных абрадаў, беларусы Віцебшчыны маюць і свае «спецыфічныя». Акрамя таго, ён апісвае працэдуры, звязаныя з падрыхтоўкай сялян да смерці, абрад абмывання нябожчыка, галашэнні па памерламу. Пэўную ўвагу аўтар удзяляе памінальным звычаям. Ён гаворыць пра персанальныя памінальныя дні, а таксама згадвае і апісвае тры агульныя – Радаўніцу, першы дзень Троіцы і Зміграўскую суботу. Як адну з асаблівасцяў памінання на Троіцу В. Далгарукаў вызначае «апахіванне» магілы (ужо згаданы вышэй звычай «парыць старыкоў»). Акрамя таго, аўтар указвае на некаторыя асаблівасці пахавальнага абраду беларусаў каталіцкага і праваслаўнага веравызнання.

Важнымі крыніцамі для даследавання пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння з'яўляюцца нарысы **А.Р. Пшчолкі.** Нягледзячы на сваю белетрызаванасць, гэтыя працы змяшчаюць каштоўныя матэрыялы. Адной з першых публікацый аўтара стаў нарыс «Дзяды. Этнаграфічны нарыс з жыцця Лепельскіх беларусаў» (1898 г.) [26]. На прыкладзе жыхароў в. Падмікітаўцы аўтар апавядае пра звычай памінання памерлых беларусамі Лепельшчыны. А.Р. Пшчолка характарызуе падрыхтоўку да свята, апісвае стравы на памінальным стале і ўласна застолле. Блізкай тэматычна і стылёва да «Дзядоў» была праца А.Р. Пшчолкі «Мікітавы хаўтуры» (1910 г.) [27]. У гэтым нарысе аўтар зрабіў апісанне пахавання аднаго селяніна – дзеда Мікіты (адсюль і назва). У творы акрамя паэтапнага апісання самога абраду змешчаны таксама і тэксты галашэнняў. Асаблівую ўвагу аўтар звяртае на празмернае ўжыванне алкаголю ў час пахавальнага абраду (як, дарэчы, і у час Дзядоў). Тэму ўжывання алкаголю на пахаванні і памінках аўтар працягвае ў кнізе «Нарысы і расказы з жыцця беларускай вёскі»[1] (1906 г.) [28], дзе гэтаму пытанню прысвячае асобны раздзел «Гарэлка на хаўтурах» [28, с. 69 – 73]. А.Р. Пшчолка пазначае, што ніводнае пахаванне і памінкі ў беларусаў Лепельшчыны не адбываюцца без алкаголю. Ён прыводзіць нават прыклад, калі сяляне не прыйшлі на хаўтуры, на якіх не было гарэлкі.

Шэраг матэрыялаў, якія адносяцца да пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ўтрымліваецца і на старонках перыядычнага друку. Некаторыя звесткі аб памінальных звычаях знаходзім у артыкуле «Памінанне нябожчыкаў (з прыхадскога жыцця)», што быў змешчаны ў неафіцыйным аддзеле «Полацкіх епархіяльных ведамасцей» за 1906 г. (№ 20) [29]. Аўтар яго невядомы, застаўся толькі псеўданім **Свой**. У гэтай працы прыведзены некаторыя апісанні і разважанні аўтара пра памінальныя

[1] У гэтым выданні змешчана раздзел «Дзяды», які поўнасцю паўтарае мінулае выданне.

звычаі ў Змітраўскую суботу. Гэтыя апісанні, пераважна, датычаць рэлігійнай часткі абраду, а менавіта асвячэння ў царкве куцці і яе падзеле.

Значная колькасць этнаграфічных даследаванняў, прысвечаных беларусам, была змешчана ў перыядычных выданнях Рускага геаграфічнага таварыства. Так, у «Запісках» Паўночна-Заходняга аддзялення РГТ за 1910 год была апублікавана праца **В.В. Іванова** «Прыметы і павер'і сялян Віцебскага павета Віцебскай губерні» [30]. У гэтым артыкуле знаходзім шэраг прымет і павер'яў, што адносяцца і да пахавальнага абраду [30, с. 208, с. 213].

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя ў беларускай этнаграфіі з'яўляецца цэлая плеяда навукоўцаў, чыя дзейнасць была скіравана не толькі на збіранне і публікацыю «сырога» этнаграфічнага матэрыялу, але і на яго аналіз і тэарэтычнае асэнсаванне. Так, спробу выкарыстаць эвалюцыянісцкія метады для вывучэння беларускай народнай культуры зрабіў **Адам Багдановіч**. Асноўнай працай, дзе А. Багдановіч прадставіў сваю пазіцыю, была кніга «Перажыткі старажытнага светапогляду беларусаў» [31], якая выйшла ў 1895 годзе. Матэрыялы да кнігі аўтар збіраў у Барысаўскім, Ігуменскім, Слуцкім і Навагрудскім паветах Мінскай губерні, Сенненскім і Аршанскім паветах Магілёўскай губерні і Лепельскім павеце Віцебскай губерні. У гэтай працы аўтар прыводзіць багаты этнаграфічны матэрыял па пахавальных і памінальных абрадах беларусаў. Характарызуючы памінальныя традыцыі, А. Багдановіч апісвае цікавы звычай «Бабы», які спраўлялі лепельскія беларусы напярэдадні Дзядоў [31, с. 56].

«Вяршыняй аналітычнай думкі ў беларускай дарэвалюцыйнай этнаграфіі» [32, с. 46] сталі даследаванні выдатнага філолага-славіста, этнографа, фалькларыста, палеографа і бібліёграфа **Яўхіма Хведаравіча Карскага**. Навуковая спадчына вучонага была вельмі багатая. Але галоўнай яго працай, «вянцом навуковай дзейнасці Я. Карскага, Кнігай кніг яго жыцця» [33, с. 19] стала фундаментальная праца «Беларусы». У сваім даследаванні Я. Карскі разглядае і пахавальна-памінальную абраднасць беларусаў. У III томе «Беларусаў» аўтар гэтай праблематыцы прысвячае асобны раздзел «Абрады пры пахаванні і памінальныя галашэнні» [34, с. 388 – 415]. Акрамя таго, аналіз памінальных традыцый на Вялікдзень і Радаўніцу знаходзім у раздзеле «Вясеннія абрады і песні» [34, с. 263, с. 266 – 269], а на Тройцу – у раздзеле «Русальны, ці зялёны, тыдзень. Сёмуха – Троіцын дзень» [34, с. 276] таго ж тома. Праводзячы даследаванне пахавальна-памінальнай абраднасці беларускага насельніцтва, аўтар актыўна выкарыстоўваў матэрыялы, змешчаныя ў зборніках П. Шэйна і М. Нікіфароўскага, якія адносяцца і да Падзвіння.

Пэўную цікавасць сярод агульнаэтнаграфічных прац пачатку XX стагоддзя мае IX том выдання «Расія. Поўнае геаграфічнае апісанне нашай Айчыны» (1905 г.), які быў прысвечаны Беларусі. Праца змяшчае багатыя кліматычныя, геалагічныя, геаграфічныя, эканамічныя, гістарычныя і этнаграфічныя звесткі. Гісторыка-этнаграфічныя раздзелы кнігі былі напісаныя **М.В. Доўнар-Запольскім і Д.З. Шэндрыкам.** Так, у раздзеле «Размеркаванне насельніцтва Верхняга Падняпроўя і Беларусі на тэрыторыі, яго этнаграфічны склад, побыт і культура» знаходзім характарыстыку пахавальна-памінальнага абраду [35, с. 179 – 183]. Многія матэрыялы, што выкарыстоўваюцца для асвятлення пазначанай праблематыкі, адносяцца да Падзвіння.

У перыяд станаўлення беларускай савецкай этнаграфіі адной з найбольш змястоўных прац, якая ўтрымлівае матэрыялы па пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння стаў зборнік **А.А. Шлюбскага** (у дзвюх частках) «Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны» (1927 – 1928 гг.). Другая частка зборніка была цалкам прысвечана сямейнаму быту і звычаёваму праву беларусаў Віцебшчыны. У гэтай частцы тэме пахавальна-памінальнай абраднасці аўтар прысвяціў спецыяльны раздзел «Хаўтурныя галашэнні» [36, с. 217 – 229], які складаецца з трох падраздзелаў. Першы з іх («Вынік збіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне галашэнняў і хаўтурных звычаяў» [36, с. 219 – 220]) змяшчае бібліяграфію і пералік аўтараў і выданняў па кожным павеце. У другім падраздзеле («Хаўтурныя звычаі» [36, с. 221 – 222]) А. Шлюбскі прыводзіць прыкметы, што датычаць розных бакоў пахавальна-памінальнай абраднасці, а таксама коратка гаворыць пра назвы галашэнняў на Віцебшчыне. Трэці падраздзел («Тэксты галашэнняў» [36, с. 222 – 229]) змяшчае ўласна самі галашэнні.

Этнаграфічнае вывучэнне беларускага этнасу ў 20-я гады XX стагоддзя не абмяжоўвалася рамкамі беларускай савецкай этнаграфіі. Навуковыя цэнтры ўзнікалі і за межамі БССР. Так, у Коўне (Літва) з 1923 па 1927 год **Вацлаў Ластоўскі** выдае навукова-літаратурны часопіс «Крывіч», у якім друкаваліся і этнаграфічныя даследаванні. Цікавы і змястоўны матэрыял пра памінальныя дні ў беларусаў Дзісеншчыны знаходзім у артыкуле «Крывічанскія дзяды» [37], што быў змешчаны ў часопісе «Крывіч» за 1927 год. Аўтарам артыкула з'яўляецца сам В. Ластоўскі, які падпісаўся псеўданімам **Пагашчанін**. Апісанні памінальных звычаяў, што прыводзяцца ў працы, заснаваныя пераважна на ўласных назіраннях аўтара і ўспамінах яго родных. У артыкуле галоўным чынам вядзецца гаворка пра двое Дзядоў: веснавыя – «Наўскі Вялікдзень» і восеньскія – «Вялікія» Дзяды. Першыя з іх былі прысвечаны «наўцам» (нядаўна памерлым), а другія – цэламу роду.

Інтарэс да беларускай народнай культуры, у тым ліку і да пахавальна-памінальнай абраднасці, праяўляўся і з боку польскіх вучоных. У 1925 годзе ў часопісе «Lud» выходзіць праца **Ю. Галомбэка** «Беларускія дзяды» [38]. Характарызуючы памінальныя традыцыі беларускага насельніцтва, аўтар актыўна выкарыстоўваў і матэрыялы з Падзвіння, змешчаныя ў працах М. Анімеле, М. Нікіфароўскага, П. Шэйна.

Якасна новы этап у развіцці беларускай этналагічнай навукі пачаўся пасля Вялікай Айчыннай вайны. Актывізацыі этнаграфічных і фальклорных даследаванняў спрыяла стварэнне ў 1957 годзе Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ІМЭФ) з асобным сектарам этнаграфіі. У 50 – 80-я гады ІМЭФ быў галоўным цэнтрам вывучэння Падзвіння. Нягледзячы на тое, што ў пасляваенныя гады асноўная ўвага надавалася вывучэнню матэрыяльнай спадчыны беларусаў, праблемы духоўнай культуры, у тым ліку і пахавальна-памінальнай абраднасці, таксама не абміналіся. У гэты час у ІМЭФ актыўна праводзяцца этнамузыкалагічныя даследаванні. Значную ролю ў актывізацыі навукова-даследчыцкай і збіральніцкай дзейнасці ў галіне музычнага фальклору адыграла **З.Я. Мажэйка**. Паставіўшы за мэту поўнае вывучэнне ўсіх рэгіёнаў Беларусі, яна праводзіла шматлікія экспедыцыі, у тым ліку і на Падзвінне. Вынікам навуковай дзейнасці даследчыцы ў гэтым рэгіёне стаў зборнік «Песні беларускага Паазер'я» (1981 г.) [39]. Кніга ўтрымлівае багаты фальклорны матэрыял па многіх элементах каляндарнай і сямейнай абраднасці. Праца змяшчае і тэксты галашэнняў з нотамі, запісаныя ў Верхнядзвінскім, Лепельскім і Расонскім раёнах [39, с. 250 – 258].

Значнай падзеяй у вывучэнні пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў стаў выхад у 1986 годзе ў серыі «Беларуская народная творчасць» зборніка «Пахаванні. Памінкі. Галашэнні» [40]. Кніга стала фактычна першым выданнем, якое аб'яднала этнаграфічныя, фальклорныя і музычныя матэрыялы па дадзенай праблематыцы. Том суправаджаецца двума ўступнымі тэарэтычнымі артыкуламі. Першы з іх «Беларускія жалобныя абрады і галашэнні» (аўтар **У.А. Васілевіч**) [41] змяшчае гістарыяграфічны агляд важнейшых прац, прысвечаных пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў, а таксама характарыстыку і апісанне пахавальнага абраду, памінак і галашэнняў. У другім артыкуле «Пахавальныя галашэнні ў сучасных запісах. Тыпы напеваў і раёны іх пашырэння» [42] яго аўтар **Т.Б. Варфаламеева** не толькі вызначыла ролю і месца гэтага спецыфічнага жанру беларускай народнай культуры, але і паказала лакальныя асаблівасці пашырэння напеваў пахавальных галашэнняў. Акрамя таго, зборнік змяшчае запісы пахавальных і памінальных абрадаў [40, с. 97 – 192], а таксама тэксты галашэнняў [40, с. 193 – 243]. Пры падрыхтоўцы зборніка былі выкарыстаны матэрыялы як з ужо выдадзеных прац, так і архіўныя запісы. Многія з гэтых матэрыялаў адносяцца да Падзвіння.

Пачынаючы з 90-х гадоў ХХ стагоддзя айчынная этналагічная навука набыла новы імпульс для свайго развіцця. Атрыманне Беларуссю незалежнасці выклікала яшчэ большую цікавасць да культуры беларускага этнасу, у тым ліку і да яе народных (традыцыйных) форм. У гэты час значна актывізавалі сваю дзейнасць ужо існуючыя ўстановы, што займаліся этнаграфічным даследаваннем Беларусі, а таксама былі ўтвораны новыя дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі і цэнтры. Па-ранейшаму адно з вядучых месцаў у даследаванні Падзвіння належала ІМЭФ, сярод супрацоўнікаў якога адным з самых актыўных даследчыкаў пахавальнай і памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння быў **Уладзімір Мінавіч Сысоў**. Працуючы над пазначанай праблематыкай, даследчык зрабіў шэраг экспедыцый на Падзвінне. У выніку быў сабраны значны этнаграфічны і фальклорны матэрыял, які ўвайшоў у яго дысертацыю і манаграфіі [43 – 45]. Даследаванні У. Сысова займаюць выключнае месца ў вывучэнні пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў. Яго праца «Беларуская пахавальная абраднасць: Структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння» (1995 г.) [44] стала першым навуковым манаграфічным даследаваннем гэтага сегмента народнай культуры беларускага этнасу.

Сярод даследчыкаў-супрацоўнікаў ІМЭФ вывучэннем памінальнай абраднасці актыўна займаецца **В.М. Шарая**. Па гэтай праблематыцы даследчыцай была абаронена доктарская дысертацыя [47]. Яе працы [48 – 53] прысвечаны пераважна даследаванню каштоўнасна-нарматыўнай сістэмы ўшанавання продкаў і асаблівасцяў яе трансфармацыі ў традыцыйнай духоўнай культуры ўсходніх славян.

Для сучаснага перыяду развіцця беларускай этналагічнай навукі характэрнай рысай стала выданне абагульняючых прац, прысвечаных беларускаму этнасу. Сярод іх найперш неабходна ўзгадаць серыю «Беларусы», падрыхтоўкай якой займаюцца супрацоўнікі ІМЭФ. Кожны з тамоў складзены па тэматычным прынцыпе. У 2001 годзе выйшаў пяты том «Беларусаў» [54], які быў прысвечаны даследаванню асаблівасцяў развіцця сямейнага ўкладу жыцця беларусаў у мінулы і сучасны перыяды. Выданне змяшчае раздзел, прысвечаны пахавальна-памінальнай абраднасці, аўтарам якога з'яўляецца **Т.І. Кухаронак** [55]. У гэтым раздзеле на аснове багатага фактычнага матэрыялу прадстаўлена падрабязнае даследаванне пахавальна-памінальных звычаяў і абрадаў беларусаў на працягу многіх стагоддзяў – ад сярэдніх вякоў і да нашага часу.

Вялікае значэнне ў этнаграфічным даследаванні Падзвіння належыць **Беларускаму дзяржаўнаму інстытуту праблем культуры** (БелДІПК), які быў арганізаваны ў 1991 годзе. У 1993 годзе пры аддзеле народнай творчасці БелДІПК была створана лабараторыя традыцыйнага мастацтва. З 1993 па 2006 год лабараторыя прымала ўдзел у распрацоўцы і рэалізацыі трох праектаў, якія датычылі этнаграфічнага і фальклорнага вывучэння Падзвіння. У 1995 і 1996 гадах праводзіліся экспедыцыі па Бярэзінскай воднай сістэме. Другі праект, які праводзілі сумесна з Браслаўскім этнаграфічным музеем, датычыўся вывучэння культурных традыцый стараверскага насельніцтва. Трэці праект быў звязаны з распрацоўкай тэмы «Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў Паазер'я (Віцебшчына)» [46, с. 146 – 147]. Вынікам працы над гэтай тэмай стаў выхад 2-га тома з серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (2004 г.),

прысвечаны Віцебскаму Падзвінню [56]. Выданне ўтрымлівае матэрыялы і па пахавальна-памінальнай абраднасці. Гэтай праблематыцы прысвечаны спецыяльны раздзел «Пахавальна-памінальныя звычаі і абрады» [57], аўтарамі якога з'яўляюцца **Т.І. Кухаронак** і **Т.Б. Варфаламеева**. Раздзел складаецца з двух падраздзелаў: уласна «Пахавальна-памінальныя звычаі і абрады» [57, с. 376 – 387] і «Пахавальныя галашэнні» [57, с. 388 – 396]. У першым падраздзеле аўтары аналізуюць пахавальна-памінальныя традыцыі беларусаў Падзвіння, асноўваючыся на матэрыялах палявых даследаванняў (экспедыцыі 1984, 1997 – 1998 гг. у Бешанковіцкі, Гарадоцкі, Глыбоцкі, Міёрскі, Расонскі, Чашніцкі і Шаркаўшчынскі раёны). Другі падраздзел утрымлівае тэксты саміх галашэнняў. Акрамя таго, у іншых раздзелах выдання змешчаны апісанні памінальных традыцый беларусаў Падзвіння на Масленіцу [58], Вялікдзень і Радаўніцу [59], Тройцу [60] і восеньскія Дзяды [61].

Этнаграфічнае і фальклорнае даследаванне Падзвіння ў 90 – 2000-я гады праводзіцца і ў вышэйшых навучальных установах Беларусі. Сярод іх **Беларускі дзяржаўны універсітэт, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка, Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава і Полацкі дзяржаўны універсітэт**. Менавіта апошняму належыць адно з вядучых месцаў у даследаванні Падзвіння. На базе гісторыка-філалагічнага факультэта Полацкага дзяржаўнага універсітэта з 1995 года штогод праходзяць трохтыднёвыя этнаграфічныя экспедыцыі, якія адбываюцца ў межах практыкі студэнтаў-гісторыкаў першага курса. Акрамя таго, ладзяцца і кароткачасовыя экспедыцыі на працягу ўсяго года. Характэрнай асаблівасцю этнаграфічных экспедыцый ПДУ з'яўляецца іх комплекснасць [46, с. 151]. У час палявых даследаванняў збіраецца інфармацыя па самым шырокім спектры народнай культуры, у тым ліку і па пахавальна-памінальнай абраднасці. Вынікі палявых экспедыцый, праведзеных за 1995 – 2006 гады ў больш за 400 населеных пунктаў Беларускага Падзвіння ўвасобіліся ў вялікім аб'ёме каштоўных матэрыялаў [62, с. 4]. Разам з тым этнаграфічнае вывучэнне рэгіёну на базе ПДУ не абмяжоўваецца толькі палявымі даследаваннямі. Актыўна вядзецца праца па аналізу і тэарэтычнаму асэнсаванню сабранага матэрыялу, у тым ліку і па пахавальна-памінальнай абраднасці. Гэта выражаецца ў публікацыях як выкладчыкаў [63], так і студэнтаў [64 – 65].

Акрамя дзяржаўных арганізацый, што займаюцца этнаграфічным вывучэннем Падзвіння, у 90 – 2000-я гады паўстаюць і недзяржаўныя. Сярод іх асобнае месца займае Рэспубліканскае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне **«Студэнцкае этнаграфічнае таварыства»** (СЭТ). Пачынаючы з 1998 года СЭТ рэгулярна займаецца палявой этнаграфічнай дзейнасцю, у тым ліку і на Падзвінні. У выніку сабраны багаты фальклорна-этнаграфічны архіў, які ўтрымлівае матэрыялы па ўсіх сферах народнай культуры беларусаў, у тым ліку і па пахавальна-памінальнай абраднасці [46, с. 149].

Пэўнае значэнне ў вывучэнні народнай культуры канкрэтных рэгіёнаў Падзвіння адыграла падрыхтоўка і выданне гісторыка-дакументальных хронік **«Памяць»**, кожны з тамоў якой быў прысвечаны асобнаму раёну. Разам з гістарычнымі матэрыяламі большасць выданняў утрымліваюць раздзелы, прысвечаныя народнай культуры, у тым ліку і пахавальна-памінальнай абраднасці. Аўтарамі гэтых артыкулаў з'яўляюцца як прафесійныя навукоўцы-этнографы, так і мясцовыя даследчыкі [66 – 73].

У 2000 годзе Dzianis Ramaniuk і выдавецтва «Наша Ніва» пры Беларускім інфармацыйным цэнтры ў Літве выдалі манаграфію прафесара **Міхася Раманюка** «Беларускія народныя крыжы» [74]. Гэта праца з'явілася ўжо пасля смерці аўтара. Матэрыялы, што ўвайшлі ў даследаванне, збіраліся навукоўцам на працягу 25 гадоў па ўсіх рэгіёнах Беларусі, у тым ліку і на Падзвінні. У манаграфіі прадстаўлена поўная сістэматызацыя і класіфікацыя гэтай часткі народнай культуры беларусаў. Упершыню ў гісторыі беларускай этнаграфіі М. Раманюк апісаў усе формы і віды крыжоў, іх функцыі, даў характарыстыку надмагільным помнікам, а таксама вызначыў іх месца ў пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў.

**Заключэнне.** Падводзячы вынік, неабходна адзначыць, што гісторыя вывучэння пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння мае даўнюю традыцыю. Першыя працы, што змяшчаюць матэрыялы па гэтай праблематыцы з'явіліся яшчэ ў канцы XVI стагоддзя. Але па-сапраўднаму цікавасць да беларускага народа і яго культуры абуджаецца толькі ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя і звязана з уплывам рамантызму. Для першай паловы XIX стагоддзя этнаграфічныя даследаванні, прысвечаныя вывучэнню беларускай народнай культуры, у тым ліку і пахавальна-памінальнай абраднасці, насілі спарадычны і аматарскі характар. Пачынаючы з другой паловы XIX стагоддзя, яны ўжо набываюць навуковы і мэтанакіраваны характар. Аднак па-ранейшаму для даследаванняў гэтага перыяду характэрна слабая распрацаванасць метадаў збору і амаль поўная адсутнасць інтэрпрэтацыі сабранага матэрыялу. Працы пераважна носяць апісальны характар. Толькі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя з'яўляюцца навукоўцы, чыя дзейнасць была скіравана не толькі на збіранне і публікацыю «сырога» этнаграфічнага матэрыялу, але і на яго аналіз і тэарэтычнае асэнсаванне. Далейшае вывучэнне пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння звязана са станаўленнем і развіццём беларускай савецкай этнаграфіі. Але ў выніку неспрыяльных палітычных умоў, якія негатыўным чынам паўплывалі на развіццё этнаграфічных даследаванняў, у даваенны перыяд фактычна адзінай працай, дзе разглядаліся пахавальныя і памінальныя традыцыі беларусаў Падзвіння, стала другая частка «Матэрыялаў...» А. Шлюбскага. У першай палове XX стагоддзя этнаграфічнае вывучэнне беларускага этнасу не абмяжоўвалася рамкамі беларускай савецкай

этнаграфіі. Навуковыя публікацыі, прысвечаныя даследаванню пахавальна-памінальнай абраднасці з'яўляюцца і за межамі БССР (Польшча, Літва). Новы перыяд у вывучэнні пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння пачаўся пасля Вялікай Айчыннай вайны. Галоўным цэнтрам, дзе праводзіліся даследаванні па дадзенай праблематыцы ў гэты час, стаў ІМЭФ. Найбольш плённы этап у вывучэнні народнай культуры беларусаў, у тым ліку і пахавальна-памінальнай абраднасці, пачаўся з 90-х гадах XX стагоддзя. Для гэтага часу характэрна выданне як абагульняючых прац па дадзенай праблематыцы, так і даследаванне паасобных яе аспектаў. У гэты перыяд актывізавалі сваю дзейнасць ужо існуючыя установы, а таксама створаны новыя. Адно з вядучых месцаў у этнаграфічным даследаванні Падзвіння на сучасным этапе належыць Полацкаму дзяржаўнаму універсітэту. Такім чынам, за працяглы перыяд пошукаў і вывучэння пазначанай праблематыкі быў назапашаны багаты фактычны матэрыял. На яго аснове з'явіўся шэраг даследаванняў, якія адрозніваюцца паміж сабой як паводле канкрэтных пытанняў, якія ў іх разглядаюцца, так і паводле падыходаў адносна іх асвятлення. Нягледзячы на гэта, на сённяшні дзень комплекснага і сістэмнага даследавання, прысвечанага пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння, не існуе, і дадзеная праблема патрабуе грунтоўнага аналізу і падрабязнага асвятлення.

ЛІТАРАТУРА


1. Одэрборн, П. Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў, [іх] шлюбныя і пахавальныя абрады, побыт, адзенне і г.д., а таксама пра веру і звычаі татараў / П. Одэрборн // Беларускі гістарычны агляд. – 2005. – Т. 12, сш. 1 – 2. – С. 167 – 189.
2. Сагановіч, Г. Паўночная Беларусь у апісанні Паўля Одэрборна / Г. Сагановіч // Беларускі гістарычны агляд. – 2005. – Т. 12, сш. 1 – 2. – С. 162 – 166.
3. Фалютынский, К. Народные праздники, увеселения, поверия и суеверные обряды жителей Белоруссии / К. Фалютынский // Вестн. Европы. – 1828. – март – апрель. – С. 75 – 92.
4. Каханоўскі, Г.А. Першыя збіральнікі і даследчыкі / Г.А. Каханоўскі // Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 47 – 76.
5. Rypiński, A. Białoruś. Kilka słów o poezii prostego ludu tej naszej polskiej prowincii; o ego muzyce, śpiwie, tańcach, etc. / A. Rypiński. – Paryz, Ksiegotłoczni J. Marylskiego, 1840. – 230 s.
6. Каханоўскі, Г.А. Беларуская фалькларыстыка 30 – 40-х гадоў XIX ст. (Я. Баршчэўскі, І. Храпавіцкі, А. Рыпінскі, Р. Зянькевіч, Л. Юцэвіч) / Г.А. Каханоўскі // Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 126 – 191.
7. Tyszkiewicz, E. Opisanie powiatu Borisowskiego pod wzgledem statystycznym, geognostycznym, historycznym, hospodarowym, przemyslowo-handlowym i lekarskim / E. Tyszkiewicz. – Wilno: Druk. Marcinowskieso, 1847. – 489, IV s.
8. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Укладанне, прадмова і каментарыі М. Хаустовіча / Я. Баршчэўскі. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.
9. Анимеле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимеле // Этнограф. сб. – 1854. – Вып. II. – С. 111 – 268.
10. Шпилевский, П.М. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических ее сказках / П.М. Шпилевский // Пантеон. – 1856. – Т. XXV. – Кн. I. – С. 1 – 30.
11. Шпилевский, П.М. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических ее сказках / П.М. Шпилевский // Пантеон. – 1853. – Т. VIII. – Кн. III. – С. 71 – 96.
12. Без-Корнилович, М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся / М.О. Без-Корнилович. – СПб., 1855. – 355 с.
13. Дмитриев, М.А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края / М.А. Дмитриев. – Вильно. Печатня А.Г. Сыркина, 1869. – 264 с.
14. Крачковский, Ю.Ф. Быт западно-русского селянина / Ю.Ф. Крачковский. – М.: Изд. имп. Общ-ва истории древностей России при Моск. ун-те, 1874. – 212 с.
15. Шейн, П.В. Белорусские народные песни / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. П. Майкова, 1874. – 548 с.
16. Серебренников, Ф. Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбе и похоронах / Ф. Серебренников // Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г. – СПб.: Тип. К. Вульфа, 1865. – С. 75 – 90.
17. Серебренников, Ф. О народных праздниках Себежского уезда / Ф. Серебренников // Памятная книжка Витебской губернии на 1867 г. – СПб.: Тип. К. Вульфа, 1867. – С. 209 – 254.
18. Нечаев, С. О поминовении умерших: нечто из религиозных обрядов и суеверий в Бегомльском приходе Борисовского уезда / С. Нечаев // Минские епархиальные ведомости. – 1874. – 15 апреля. – № 7. – Ч. неофиц. – С. 227 – 232.
19. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. имп. акад. наук, 1890. – Т. I. – Ч. II. – 586 с.
20. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. имп. Акад. наук, 1893. – Т. II. – 715 с.

21. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. имп. Акад. наук, 1902. – Т. 3. – 596 с.
22. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи... Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. Типо-Литогр., 1897. – 307 с.
23. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. тип., 1895. – VIII+548+CLIV с.
24. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. Старцы / Н.Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – 1892. – № 1. – С. 70 – 105.
25. Долгоруков, В.М. Население губернии / В.М. Долгоруков // Витебская губерния. Историко-географический и статистический обзор. – Витебск, 1890. – Вып. I. – С. 231 – 300.
26. Пщелко, А.Р. Деды / А.Р. Пщелко. – Витебск: Губерн. Типо-Литогр., 1898. – 23 с.
27. Пщелко, А.Р. Микитовы хаутуры / А.Р. Пщелко. Очерк из белорусской жизни. – Витебск: Типо-Литогр. П.А. Подземского, 1910. – 53 с.
28. Пщелко, А.Р. Очерки и рассказы из жизни белорусской деревни / А.Р. Пщелко. – 1906, Вильна: Тип. «Русский почин». – 248 с.
29. Свой. Поминовение усопших (из приходской жизни) / Свой // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1906. – 15 окт. – № 20. Неофиц. отдел. – С. 716 – 717.
30. Иванов, В.В. Приметы и поверья крестьян Витебского уезда Витебской губернии / В.В. Иванов // Записки Северо-Западного отделения ИРГО. – Вильна: Тип. А.Г.Сыркина, 1910. – Кн. 1. – С. 208 – 213.
31. Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: этнограф. очерк А.Е. Богданович. – Минск: Беларусь, 1995. – 186 с. (Репринт. изд.).
32. Лобач, У.А. Этнаграфія Беларусі / У.А. Лобач. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 328 с.
33. Янушкевіч, Я. Яўхім Карскі і яго «Беларусы» / Я. Янушкевіч, К. Цвірка // Карскі Я. Беларусы / уклад. і камент. С. Гараніна і Л. Ляўшун; навук. рэд. А. Мальдзіс; прадм. Я. Янушкевіча і К. Цвіркі. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2001. – С. 5 – 30.
34. Карскі, Я. Беларусы / уклад. і камент. С. Гараніна і Л. Ляўшун; навук. рэд. А. Мальдзіс; прадм. Я. Янушкевіча і К. Цвіркі / Я. Карскі. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2001. – 640 с.
35. Шендрик, Д.З. Распределение населения Верхнего Поднепровья и Белоруссии по территории, его этнографический состав, быт и культура / Д.З. Шендрик, М.В. Довнар-Запольский // Россия: полное геогр. описание нашего Отечества / под ред. В.П. Семенова. – СПб.: Изд. А.Ф. Девриена, 1905. – Т. 9: Верхнее Поднепровье и Белоруссия. – С. 126 – 227.
36. Шлюбскі, А. Матар'ялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны / А. Шлюбскі. – Мінск: Ін-т бел. культуры, 1928. – Ч. 2. – 259 с.
37. Пагашчанін. Крывічанскія дзяды / Пагашчанін // Крывіч. – ліпень 1926 – сакавік 1927. – № 12. – С. 66 – 69.
38. Gołobek, J. Dziady białoruskie / J. Gołobek // Lud. – 1925. – T. 4, ser. 2, ogulnego zbioru t. 25. – S. 1 – 40.
39. Мажэйка, З.Я. Песні беларускага Паазер'я / З.Я. Мажэйка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 494 с.
40. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / рэд.кал. А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]; укл. тэкстаў, уступ. арт. і камент. У.А. Васілевіча; Артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.
41. Васілевіч, У.А. Беларускія жалобныя абрады і галашэнні / У.А. Васілевіч // Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / рэд. кал. А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]; Укладанне тэкстаў, уступ. арт. і камент. У.А. Васілевіча; Артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – С. 5 – 59.
42. Варфаламеева, Т.Б. Пахавальныя галашэнні ў сучасных запісах. Тыпы напеваў і раёны іх пашырэння / Т.Б. Варфаламеева // Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / рэд.кал. А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]; Укладанне тэкстаў, уступ. арт. і камент. У.А. Васілевіча; Артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – С. 60 – 96.
43. Сысов, В.М. Белорусские голошения в структуре погребальной обрядности: автореф. дис. ... канд. филол. наук / В.М. Сысов; ИИЭФ АНБ. – Мінск, 1993. – 23 с.
44. Сысоў, У.М. Беларуская пахавальная абраднасць: Структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння / У.М. Сысоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 182 с.
45. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных / У.М. Сысоў. – Мінск: Выш. шк., 1997. – 415 с.
46. Бабіч, А.Ю. Гісторыя этнаграфічнага і фальклорнага вывучэння Падзвіння ў другой палове XX – пач. XXI ст. / А.Ю. Бабіч // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку): зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20 – 21 лістап. 2008 г. / пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – С. 143 – 153.
47. Шарая, В.М. Ушанаванне продкаў у традыцыйнай культуры: семантыка, аксіялогія, трансфармацыя: аўтарэф. дыс. ... д-ра філал. навук / В.М. Шарая. – Мінск, 2002. – 38 с.
48. Шарая, О.Н. Ценностно-нормативная природа почитания предков / О.Н. Шарая. – Мінск: Тэхналогія, 2002. – 249 с.

49. Шарая, В.М. Канцэпт *род* у духоўнай культуры ўсходніх славян / В.М. Шарая // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2000. – № 3. – С. 93 – 97.
50. Шарая, В.М. Ушанаванне продкаў як даследчыцкая праблема ў працах Э. Тайлара і Г. Спенсера / В.М. Шарая // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2001. – № 4. – С. 73 – 76.
51. Шарая, В.М. Сімволіка зяляніны як рэпрэзентацыя продкаў у архаічным абрадзе / В.М. Шарая // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2002. – № 3. – С. 73 – 79.
52. Шарая, В.М. Трансфармацыя каштоўнасна-нарматыўнай сістэмы ўшанавання продкаў / В.М. Шарая // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2002. – № 4. – С. 78 – 82.
53. Шарая, В.М. Абрады беларусаў на Тройцу: рэгіянальная спецыфіка / В.М. Шарая // Язык в свете классического наследия и современных парадигм: VIII Карские Междунар. чтения. – Минск – Гродно, 2000. – С. 112 – 114.
54. Беларусы. Т. 5: Сям'я / В.К. Бандарчык [і інш.]; рэдкал.: В.К. Бандарчык [і інш.]; ІМЭФ НАНБ. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 375 с.
55. Кухаронак, Т.І. Пахавальна-памінальныя звычаі і абрады / Т.І. Кухаронак // Беларусы / В.К. Бандарчык [і інш.]; рэдкал.: В.К. Бандарчык [і інш.]; ІМЭФ НАНБ. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 5: Сям'я. – С. 351 – 369.
56. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6-ці т. / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – 910 с.
57. Кухаронак, Т.І. Пахавальна-памінальныя звычаі / Т.І. Кухаронак, Т.Б. Варфаламеева // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6-ці т. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – С. 376 – 396.
58. Басько, В.І. Памінальная субота / В.І. Басько, А.М. Боганева, Т.Б. Варфаламеева // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6-ці т. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – С. 65.
59. Басько, В.І. Памінанне продкаў у Пасхальны тыдзень і на Радаўніцу / В.І. Басько, Т.Б. Варфаламеева // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6-ці т. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – С. 98 – 100.
60. Басько, В.І. Памінанне продкаў / В.І. Басько, Т.Б. Варфаламеева // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6-ці т. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – С. 110 – 111.
61. Боганева, А.М. Дзяды / А.М. Боганева // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6-ці т. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2. Віцебскае Падзвінне. – С. 205 – 207.
62. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / склад. У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – Ч. 1. – 148 с.
63. Лобач, У.А. Сімвалічны статус і рытуальныя функцыі могілак у беларускай народнай культуры вярхоўяў Бярэзіны і Віліі XX – пач. XXI ст. / У.А. Лобач // Веснік Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гуманітарныя навукі. – 2008. – № 1. – С. 71 – 82.
64. Азевіч, І.В. Традыцыйная пахавальная абраднасць беларусаў Падзвіння і Палесся другой паловы XIX – пач. XX ст.: этнаграфічна-параўнальная характарыстыка / І.В. Азевіч // Инновационное развитие Придвинского края: сб. науч. тр. регион. науч.-практ. конф. студентов, магистрантов и аспирантов, Новополоцк – Полоцк, 18 – 19 дек. 2007 года. – Новополоцк: ПГУ, 2007. – С. 55 – 58.
65. Азевіч, І.В. Структурна-семантычны аналіз традыцыйнага пахавальнага абраду беларусаў Падзвіння канца XIX – пач. XX ст. / І.В. Азевіч // Труды молодых спец. Полоц. гос. ун-та. – 2008. – Вып. 28. Гуманитар. науки. – С. 22 – 25.
66. Валодзіна Т.В. Традыцыі і звычаі / Т.В. Валодзіна // Памяць: Лепельскі раён: гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск: Беларусь, 1999. – С. 604 – 605.
67. Гарошка, Т.Г. Народныя святы, абрады, звычаі / Т.Г. Гарошка // Памяць: гіст.-дак. хроніка Пастаўскага раёна. – Мінск: Белта, 2001. – С. 593 – 599.
68. Дарожкіна, В.С. Народныя традыцыі і звычаі / В.С. Дарожкіна // Памяць: гіст.-дак. хроніка Сенненскага раёна. – Мінск: Паліграфафармленне, 2003. – С. 571 – 574.
69. Крук, І.І. Народныя абрады і звычаі Верхнядзвіншчыны / І.І. Крук // Памяць: гіст.-дак. хроніка Верхнядзвінскага раёна: у 2 кн. – Мінск: Паліграфафармленне, 2000. – Кн. 2-я. – С. 292 – 319.
70. Лакотка, А.І. Народнае дойлідства Докшыцкага раёна / А.І Лакотка // Памяць: гіст.-дак. хроніка Докшыцкага раёна. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 655 – 664.
71. Сінкевіч І.Л. Песенная спадчына Расоншчыны // Памяць: гіст.-дак. хроніка Расонскага раёна. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 542 – 546.
72. Сысоеў, У. Пахавальна-памінальная абраднасць / У. Сысоеў // Памяць: гіст.-дак. хроніка Дубровенскага раёна. – Мінск: Паліграфафармленне, 1997. – Кн. 1. – С. 532 – 533.
73. Шагалеева, Т.А. Традыцыі, абрады, вераванні / Т.А. Шагалеева // Памяць: Гарадоцкі раён: гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 744 – 748.
74. Раманюк, М. Беларускія народныя крыжы / М. Раманюк. – Вільня: Наша Ніва, 2000. – 221 с.


*Паступіў 20.04.2009*